Ямайка, а Франции – о. Тортуга. Часть их населения была задействована в каперских/рейдерских операциях, в том числе для этого использовались эмигранты из вышеназванных стран.

Таким образом, в работе рассмотрена возможность реконструкции на основании сопоставления имеющихся данных о бродниках и схожих группах населения. Дано авторское определение понятия «Территориальное пограничное население».

**Литература**

1. Попело, А. В. Обоснование методов мониторинга земель и объектов историко-культурного назначения (на примере территории Верхнего и Среднего Дона / А. В. Попело / диссертация на соиск. учен. ст. канд. географических наук. – Воронеж : ВГПУ, 2006. – 177 с.

2. Попело, А. В. К концепции мониторинга земель и объектов историко-культурного назначения / А. В. Попело // Вестник ВГУ. – Сер. : География, Геоэкология. – Воронеж : ВГУ, 2013. – № 2 – С. 44–47.

3. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. М. ; Л. : Академия наук СССР, 1950. – 561 с.

4. Феннел, Д. Кризис Средневековой Руси 1200–1304 / Д. Феннел. – М. : Прогресс, 1989. – 296 с.

5. Возчиков, В. А. Бродники. Обаяние авантюризма / В. А. Возчиков // Культура. Духовность. Общество. – 2014. – № 9. – С. 57–62.

6. Соловьев, С. М. Сочинения в 18 кн. / С. М. Соловьев. – М. : Мысль, 1988. - – Кн. 1. – 798 с.

7. Рабинович, Р. А. Призрачная Берладь. О достоверности одной фальсификации / Р. А. Рабинович // Stratum plus. – Кишинев, 1999. – № 5. – С. 357–378.

***Поўх І.В.***
(*Рэспубліка Беларусь, г. Брэст*)

## ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ПРАСТОРЫ І ЧАСУ Ў ПОСТСТУРУКТУРАЛІСЦКАЙ І ДЭКАНСТРУКТЫВІСЦКАЙ АНТРАПАЛОГІІ

*Праца выканана пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў у межах задання “Беларуская фальклarыстыка ў сучасным свеце: метадалагічны, праблемна-тэматычны дыяпазон, тэарэтычныя навацыі”; дамова № Г20У-004, нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20201112 ад 26.06.2020*

У другой палове XX стагоддзя поструктуралісцкая – найперш, дэканструктывісцкая – крытыка ўводзіць у еўрапейскую і амерыканскую гуманітарыстыку новыя асноватворныя канцэпцыі хаосу, бязладдзя, стахастычнысці і неўпарадкаванасці. Квінтэсенцыяй тэорыі хаосу выступае, у прыватнасці, выказванне амерыканскага літаратуразнаўцы бельгійскага паходжання Поля дэ Мана (*Paul de Man*) ў артыкуле “Знявечаны Шэлі” (*Shelley Disfigured*), прысвечаным аналізу верша П. Б. Шэлі “Трыумф жыцця”: “нічога – ні ўчынак, ні слова, ні думка, ні тэкст – ніколі не адбываецца ў дачыненні –

станоўчым ці адмоўным – да нечага, што папярэднічае яму, ідзе за ім альбо існуе дзе заўгодна, а з’яўляецца выключна выпадковай падзеяй, моц якой… у выпадковасці яе ўзнікнення” [1, с. 122]. Падобна да тэорыі хаосу, дэканструктывізм, які атаясамліваецца з нелінейнай дынамікай, разбурае межы традыцыйных сістэм, прапаноўвае новыя падыходы да іх інтэрпрэтацыі: бязладдзе ўяўляецца больш прадуктыўным за ўпарадкаванасць, няпэўнасці надаецца перавага перад прадказальнасцю, а фрагментацыя разглядаецца як аб’ектыўная рэчаіснасць у супрацьвагу адвольным дэфініцыям замкнёнай сістэмы [3].

Фрагментарнасць, нелінейнасць і цыклічнасць часу і прасторы мела вынікам сцвярджэнне немагчымасці ўсталявання паходжання і першакрыніцы ўсяго існага, а таксама паяднанне хаосу, цыклічнасці і нявызначанага паходжання ў агульную сістэму ўяўленняў, якая грунтавалася на карэлятыўных канцэптах. Апісваючы постструктуралісцкую тэарэтычную мадэль сістэмы канцэптаў, польскі пісьменнік, філосаф і літаратуразнаўца Станіслаў Лем (*Stanisiaw Lem*) адзначае, што любая канструктыўная творчая дзейнасць ажыццяўляецца ў тэарэтычна замкнёнай канфігурацыйнай прасторы з тапалагічнымі ўласцівасцямі, у аднолькавай ступені залежнымі ад яе непераадольных межаў і ад аб’ектаў, якія ў іх ствараюцца [4, с. 59].

У сваю чаргу, тапалогія прасторы абмяжоўвае дыяпазон магчымых форм існавання і паядноўвае абраныя формы агульнымі ўласцівасцямі адпаведнай прасторы. Такім чынам, тапалогія прасторы выступае вызначальным фактарам, які дазваляе антраполагам, фалькларыстам і культуролагам прадказаць верагодную прысутнасць на той ці іншай тэрыторыі пэўных культурных форм і іх праявы.

Французскі філосаф Мішэль Сер (*Michel Serres*) разглядае пераход да постструктуралісцкай інтэрпрэтацыі прасторы і часу як адмову ад лінейнай храналагічнай эстэтыкі, у аснову якой кладзецца ідэя нязменна аднолькавага руху часу і адзінак яго вымярэння, на карысць эстэтыкі прасторавых дэфармацый і зон лакальнай турбулентнасці [5]. Даследчык вызначае прастору як крыніцу адрозненняў і неўпарадкаванасці, тады як час увасабляе нязменнасць, выступаючы непасрэднай і найпрасцейшай эстэтычнай праекцыяй упарадкаванай структуры [5, с. xiii]. У якасці ілюстрацыі такой неўпарадкаванасці Мішэль Сер прыводзіць спарадычную арганізацыю прасторы старажытнай Грэцыі, прыпадабняючы разрозненыя, ізаляваныя адзін ад аднаго гарады да астравоў, унутры якіх знаходзяцца людзі, а звонку – хаатычнае мноства сацыяпалітычных прастор, населеных жывёламі і варварамі. Адпаведна, прасторы не ўласцівыя такія якасці, як аднароднасць альбо шчыльная ўзаемасувязь паміж кампанентамі; лакальнае больш не з’яўляецца неад’емным унутраным складнікам глабальнага, а далучаецца да яго з дапамогай тых ці іншых пераходных элементаў. Гэта стварае

своеасаблівы дыскурсіўны ланцужок, у якім сінгулярнасць прасторы праяўляецца ў пэўны момант і выступае злучальным элементам, што, у сваю чаргу, узнімае праблему вызначэння сутнасці сінгулярнасці як адной з дыскрэтных адзінак камбінаторнага шляху альбо пераменнай з комплексам сувязяў, якія складаюць набор магчымых функцый.

Уяўленне пра прастору як разрозненую і неўпарадкаваную існасць абумовіла ўзнікненне тэорыі множнасці прастор, кожная з якіх мела ўласную складаную структуру і комплекс узаемасувязяў з іншымі прасторамі. Чалавек як біялагічны від і прадстаўнік соцыуму існуе і функцыянуе на перакрыжаванні шэрагу прастор: яго праца належыць трохмернай Эўклідавай прасторы, абранай за асноўную працаарыентаванымі культурамі чалавецтва; бачанне – праекцыйнай, фізічныя адчуванні – тапалагічнай і г.д. У выніку разнастайных гістарычных працэсаў на скрыжаванні прастор складаецца культура як своеасаблівы цэнтр міжпрасторавых узаемасувязяў [5].

Адпаведна, існуе безліч шляхоў і спосабаў абмену інфармацыяй паміж фрагментаванымі прасторамі лакальных культур. Мішэль Сер падкрэслівае, што інфармацыйная, культурная і любая іншая прастора, складзеная з фрагментаваных лакальных прастор, уяўляе сабой хутчэй перапляценне шляхоў, а не абмежаваны рэгіён. Веданне, на думку даследчыка, – гэта вандроўка паміж лакальнымі фрагментамі прасторы, адмаўленне ад падзелу і класіфікацыі на карысць пошуку адзінак, якія перамяшчаюцца ад аднаго фрагмента да іншага; засваенне кампаратыўнай і плюралістычнай эпістэмалогіі, а таксама зварот да філасофіі руху ў супрацьстаянні догмам уніфікаваных і сістэматызаваных ведаў. Такім чынам, новая інтэрпрэтацыя інфармацыйнай прасторы – ці прастораў – стварае філасофію камунікацыі як адначасовага ўвасаблення аб'ектыўнай рэчаіснасці і тэарэтычных ведаў пра яе.

Камунікатыўныя прасторы, у межах якіх перадаюцца, трансфармуюцца і множацца разнастайныя інфармацыйныя паведамленні, уяўляюць сабой своеасаблівую сетку кодаў, якія знаходзяцца ў бесперапынным руху і паядноўваюць разнастайныя часы і прасторы, культурныя формы і тэксты [5]. Такія камунікатыўныя прасторы змяшчаюцца між сферамі міфаў, легенд, гісторыі, філасофіі і навукі, судатыкненне і ўзаемапранікненне якіх значна ўскладняе іх размежаванне і спрыяе стварэнню т. зв. "полімарфічнага дыскурсу", у якім прастата, выразнасць і адназначнасць замяняюцца канцэптамі і логікай нявызначанасці, складанасці і палівалентнасці [5]. Персанажы міфаў (Адысей, Уліс і інш.) падчас сваіх вандровак праходзяць праз безліч прастор, паядноўваючы, падзяляючы і зноў паядноўваючы іх. Адпаведна, міфічны дыскурс уяўляе сабой перапляценне, перакрыжаванне і ўзаемасувязь адасобленых, замкнёных, ізаляваных, непарушных і недаступных прастор, паяднанне якіх, як сцвярджае Мішэль Сер, стварае навуку.

Прастора і дыскурс некаторых іншых жанраў – напрыклад, байкі – вызначаецца як “прастора гульні” (*game space*) [5, с. 19] і мае ўпарадкаваную нелінейную структуру, якая грунтуецца на канцэптуальна антанімічных парах (прычына – вынік, уверх – уніз, варона – лісіца і інш.). Наяўнасць пэўнага комплексу ўпарадкаваных адзінак – абавязковая ўмова стварэння прасторы гульні, аднак уласна структура гульнёй не з’яўляецца, а выступае асновай для яе канструявання. Прастора байкі мае дрэвападобную арганізацыю, у межах якой нязменныя структуры і дыялектычныя працэсы ствараюць непадзельнае адзінства. Вылучаюцца тры асноўныя элементы байкі як фальклорнага наратыву: прастора, упарадкаваная ў кола комплексам узаемасувязяў, гульня з хадамі і канцоўкай, і пераможца [5].

Сімвалам адзінства супрацьлегласцяў – жадання паказаць прастору як безліч раскіданых аб’ектаў і імкнення паяднаць адрозненні ў падабенстве – становіцца спіраль. Узыходны рух спіралі ўвасабляе імкненне да адрозненняў, якія ператвараюцца ў падабенства, калі траекторыя руху ўтварае акружнасць. Адначасова, далейшае разгортванне спіралі зноў выводзіць на першы план адрозненні – і так да бясконцасці [3]. Як сцвярджае Мішэль Сер, прастора і час знаходзяцца ў бесперапынным хаатычным руху, а ўсё навакольнае асяроддзе – і нават сусвет – мае форму не прамой ці акружнасці, а спіралі [5].

Канцэпцыя “тэмпаральнага сінтэзу”, прапанаваная французскім філосафам Жакам Дэрыда (*Jacques Derrida*), усталёўвае ўзаемасувязь паміж катэгорыямі часу і стану. Даследчык адзначае, што ўсё маўленне як увасабленне “духоўнага адбітку” таго, хто гаворыць, вызначаецца залежнасцю і адначасова прыналежнасцю да мінулага часу. Сказанае “заўжды ўжо там” [2, с. 66], і ніякае аднаўленне яго першакрыніцы не можа перавесці яго ў прастору цяперашняга часу. Абсалютнае мінулае дазваляе прасачыць з’явы і працэсы, якія немагчыма абагуліць з пункту погляду сучаснасці.

Нягледзячы на канцэптуальнае падабенства інтэрпрэтацыі часу ў тэорыі хаосу і дэканструктывісцкай крытыцы, варта заўважыць, што ў той час як дэканструктывісты імкнуцца разарваць сувязь з мінулым, прыхільнікі тэорыі нелінейнай дынамікі падкрэсліваюць пераемнасць гістарычных працэсаў. Адзначаная дыхатамія абумоўлівае, апроч іншага, дынаміку моўнага, культурнага, грамадскага і гістарычнага развіцця. Аднароднаму, размеранаму і ўпарадкаванаму часу Мішэль Сер супрацьпастаўляе канцэпцыю часу як шматвектарнага, комплекснага, непрадказальнага і стахастычнага феномена [5]. Створаная французскім навукоўцам мадэль увасабляе дыскурс новай гісторыі, якую немагчыма ўявіць у выглядзе прамой альбо крывой лініі. Гісторыя падаецца як шэраг выпадковых падзей, арганізацыйная логіка якіх не грунтуецца на першаасновах грамадскага ладу, а ствараецца ў выніку паўтаральнасці выпадковых падзей.

Адной з канцэптуальных праяў інтэрпрэтацыі прасторы і часу ў постструктуралісцкай і дэканструктывісцкай крытыцы выступае ўсведамленне непарыўнай сувязі паміж імі, немагчымасці існавання часу без аб’ектаў, змешчаных у прасторы, без іх стварэння, руху і распаду.

Такім чынам, ключавыя аспекты дэканструктывісцкай інтэрпрэтацыі прасторы і часу ахопліваюць сутнасць і аб’ём паняццяў “замкнёнасць”, “адкрытасць”, “злучальны шлях”, “разрыў”, “перарывістасць” і “бесперапыннасць”, “парогавая велічыня”, “зваротны і незваротны час”, “ліміт”, “мяжа” і інш. Пераход да постструктуралісцкай інтэрпрэтацыі прасторы і часу маркіруецца адмаўленнем ад лінейнай храналагічнай эстэтыкі, у аснову якой кладзецца ідэя нязменна аднолькавага руху часу і адзінак яго вымярэння, на карысць эстэтыкі прасторавых дэфармацый і зон лакальнай турбулентнасці, тэорыі множнасці прастор і канцэпцыі тэмпаральнага сінтэзу. Даследчыкі падкрэсліваюць фрагментарнасць, нелінейнасць і цыклічнасць часу і прасторы, з чаго вынікае немагчымасць ўсталявання паходжання і першакрыніцы культурных артэфактаў і з’яў.

**Літаратура**

1. De Man, P. The Rhetoric of Romanticism / P. de Man. – New York : Columbia University Press, 1984. – 327 p.
2. Derrida, J. Of Grammatology / J. Derrida. – Baltimore ; London : The Johns Hopkins University Press, 1997. – 360 p.
3. Hayles, K. N. Chaos Bound: Orderly Disorder in Contemporary Literature and Science / K. N. Hayles. – Itaca ; London : Cornell University Press, 1990. – 328 p.
4. Lem, S. Metafantasia: The Possibilities of Science Fiction / S. Lem // Science-Fiction Studies, 1981. – P. 54–71.
5. Serres, M. Hermes: Literature, Science, Philosophy / M. Serres. – Baltimore : Johns Hopkins University Press, 1982. – 208 p.

***Рахно К.Ю.***
(*Украина, с. Опошное*)

## ПУЧОК СОЛОМЫ С КРЫШИ КАК МАГИЧЕСКОЕ СРЕДСТВО

Этнограф Александр Сержпутовский подробно описывает белорусский обряд «запасваня гаўяда», в конце XIX – начале XX века, обычно приуроченный ко дню святого Юрия (23 апреля). Хозяин переодевался в чистое белое белье и чистую праздничную свиту, обувал новые лапти с белыми онучами, вешал через плечо пастушью торбу, в которую клал краюху хлеба, соль, «хрэшчык» – крест из хлеба, выпеченный на Хрэсцы – в среду на четвертой неделе Великого поста, три